# Непаўторнасць гучання роднага слова




Фота Кастуся Дробава.

*Падчас прэзентацыі электроннага выдання (DVD-ROM) «Не пакідайце ж мовы нашай беларускай…».*

# Веліч Францішка Багушэвіча: лічбавы фармат

Прэзентацыя электроннага выдання (DVD-ROM) «Не пакідайце ж мовы нашай беларускай…», прысвечанага 180-годдзю з дня нараджэння Францішка Багушэвіча — паэта, пісьменніка, публіцыста, аднаго з пачынальнікаў новай беларускай літаратуры і сучаснай беларускай мовы, — адбылася ў галерэі «Лабірынт» Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі.

Складальнікі падрыхтавалі самае поўнае выданне, дзе ўпершыню ў такім аб'ёме сабраны вялікі пласт матэрыялу, які прадстаўляе веліч Францішка Багушэвіча і яго творчасці. «Не пакідайце ж мовы нашай беларускай, каб не ўмёрлі!» — менавіта гэтыя словы, якія ведае кожны беларус, з прадмовы да першага зборніка вершаў Францішка Багушэвіча *«Dudka białaruskaja»* паслужылі асновай для назвы рэсурса.

Кожны знойдзе ў выданні тое, што яго абавязкова зацікавіць і закране. Тут можна пабачыць і пагартаць электронныя старонкі першых прыжыццёвых выданняў паэта, сярод якіх *«Dudka białaruskaja»* 1891 года (арыгінал захоўваецца ў Бібліятэцы Урублеўскіх Літоўскай акадэміі навук) і 1896 года (з фондаў Беларускага дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і мастацтва), пазнаёміцца з першым выданнем навершаванага зборніка *«Smyk białaruski»* з фондаў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі.




*Фота Кастуся Дробава.*

*Намеснік дырэктара па навуковай рабоце і выдавецкай дзейнасці Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Алесь Суша прадстаўляе электроннае выданне (DVD-ROM).*

Рэсурс дазваляе паглядзець на Францішка Багушэвіча вачыма мастакоў, пранікнуцца ўшанаваннем яго памяці, пачытаць лісты і рукапісы самога паэта са збораў Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры.

Выданне будзе карысным для шырокага кола карыстальнікаў — ад школьнікаў і студэнтаў да выкладчыкаў і навукоўцаў, для ўсіх, хто цікавіцца гісторыяй, культурай і літаратурай роднага краю.

**Бажэна СТРОК**

**Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.**